Т. А. ФЕДАРЭНКА, У. А. ШЫНКАРЭНКА

# НАГЛЯДНА-МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

# ПА МАСТАЦКАЙ ПРАЦЫ

## Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ ШКОЛ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ З НЕДАХОПАМІ РАЗУМОВАГА І ФІЗІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

МІНСК
1994

Рэцэнзенты:

*Серадзінская В.Х.*, метадыст Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі.

*Шайхуліна Р.Ш.*, настаўнік пачатковых класаў школы інтэрната № 10 г. Мінска

**Федарэнка Т. А., Шынкарэнка У. А.**

Наглядна-метадычныя матэрыялы па мастацкай працы ў пачатковых класах школ для дзяцей з недахопамі разумовага і фізічнага развіцця. — Мн.: НМЦэнтр, 1994. — 56 с.

Наглядна-метадычныя матэрыялы па мастацкай працы адрасуюцца настаўнікам і выхавацелям пачатковых класаў школ для дзяцей з недахопамі разумовага і фізічнага развіцця, аднак могуць выкарыстоўвацца і педагогамі масавых школ. Асноўнай асаблівасцю матэрыялаў з'яўляецца іх ілюстратыўны характар. Каб аблягчыць выкарыстанне прыведзеных у наглядна-метадычных матэрыялах відарысаў розных вырабаў, да кожнага з раздзелаў матэрыялаў распрацаваны кароткія рэкамендацыі.

© Т.А. Федарэнка, У.А. Шынкарэнка

## БЕЛАРУСКІ АРНАМЕНТ

Для аздаблення розных вырабаў на ўроках працоўнага навучання і пазакласных заняткаў па працы можна вельмі шырока выкарыстоўваць элементы традыцыйнага беларускага арнаменту, як геаметрычнага (мал. 32), так і раслiннага (мал. 33).

Арнаменты могуць ужывацца для аздаблення і плоскасных, і аб'ёмных вырабаў. Пры гэтым адна і тая ж закладка, паштоўка ці іншы выраб можа афармляцца рознымі арнаментамі, а адзін і той жа арнамент можа выкарыстоўвацца для афармлення розных вырабаў. На малюнках 34—46 паказаны розныя варыянты выкарыстання геаметрычных і раслінных арнаментаў пры аздабленні закладак.

Кожны з гэтых варыянтаў педагог можа спрасціць ці ўскладніць. Напрыклад, у арнаментах, паказаных на малюнках 34—38 можна не рабіць усе часткі. Пры спрашчэнні або ўскладненні арнаментаў неабходна захоўваць рытм (чаргаванне элементаў па форме, памеру) і сіметрыю. Колькасць і складанасць элементаў, варыянты іх чаргавання выбіраюцца настаўнікам у залежнасці ад задач навучання і рэальных магчымасцей вучняў.

Рознымі могуць быць і сродкі стварэння арнаменту. Так, геаметрычныя арнаменты могуць быць створаны ў выглядзе мазаікі, графічнага відарыса, аплікацыі з паперы або саломкі, рэльефу з пластычных матэрыялаў, малюнка, а раслінныя арнаменты, акрамя таго, і з раслінных матэрыялаў. На мал. 34—38 паказаны геаметрычныя арнаменты ў выглядзе мазаікі, а на мал. 39—43 — геаметрычныя арнаменты, якія можна зрабіць як аплікацыю з паперы ці саломкі або як графічныя відарысы (графіка па тушы).

Пры выкананні арнаментаў рэкамендуецца ўдзяліць асаблівую ўвагу знаёмству дзяцей з колерам як сродкам выяўленчай дзейнасці. Адзін і той жа ўзор можа быць "цёплым" (выкананым чырвоным, аранжавым, жоўтым колерамі) або "халодным" (пры выкарыстанні блакітнага, сіняга, фіялетавага, зялёнага колераў), яркім або пяшчотным.

У працэсе навучання рэкамендуецца вучыць дзяцей ствараць арнаменты не толькі з апорай на малюнкі і вырабы педагога, але і па задуме.



Мал. 32



Мал. 33

## ЗМЕСТ

Прадмова ........ 3
Стылізаваныя прадметныя відарысы ........ 4
Беларускі арнамент ........ 20
Мастацкія вырабы з паперы ........ 23
Агульныя метадычныя рэкамендацыі ........ 54

ФЕДАРЭНКА Таіса Андрэеўна
ШЫНКАРЭНКА Уладзімір Анатольевіч

**Наглядна-метадычныя матэрыялы**
**па мастацкай працы ў пачатковых класах школ**
**для дзяцей з недахопамі разумовага і фізічнага развіцця**

Загадчык лабараторыі *В. К. Савосцікаў.*
Рэдактар *Л. Л. Мухарская.*

Здадзена ў набор 20.06.94. Падпісана ў друк 22.07.94. Фармат 60x84/16.
Папера афсетная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 3,25. Ул.-выд. арк. 3,3.
Тыраж 3 000 экз. Заказ 13. Ліцэнзія № 633.

Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
220013, Мінск, вул. Б.Хмяльніцкага, 3.